# ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ АДУКАЦЫІ НА СТАРОНКАХ ВЫДАННЯ «ПРАЦАЎНІК АСВЕТЫ» (1928–1929 гг.)

**С. У. Шыян**

Для беларускай журналістыкі 1920-я гады сталі часам з’яўлення першых савецкіх педагагічных выданняў. Пачалі выходзіць як асобныя педагагічныя часопісы (напрыклад, у 1924 г. свет убачыў першы нумар часопіса «Асвета»), так і дадаткі да ўжо існуючых газет, прысвечаныя пытанням народнай адукацыі. Прыкладам такога дадатку з’яўляецца выданне «Працаўнік асветы», якое рыхтавалася да друку рэдакцыяй газеты «Савецкая Беларусь».

Першы нумар «Працаўніка асветы» ўбачыў свет 22 красавіка 1928 г. За невялікім выключэннем выданне, выходзіла двойчы на месяц, аднак па прычыне «вострага недахопу газетнай паперы Камітэт па справах друку пры СНК БССР вымушаны быў паставіць пытанне аб скарачэнні аб’ёму газет і спынення выдання ўсіх дадаткаў, у тым ліку і “Працаўніка асветы”» [1, с. 95].

На працягу нядоўгага існавання – выходзіў з красавіка 1928 г. па люты 1929 г. – «Працаўнік асветы» уздымаў на сваіх старонках важныя для айчыннай адукацыі пытанні. Пры гэтым актуальнасць дадатку звязвалася з актыўным удзелам у яго выданні настаўніцтва. Так, вядомы беларускі педагог і метадыст В. Самцэвіч на старонках «Працаўніка асветы» пісаў пра неабходнасць таго, «каб і “Старонка” [“Старонка асветніка” ў газеце “Савецкая Беларусь”], і дадатак [“Працаўнік асветы”] сталі больш блізкімі асветніцкай масе, каб большая колькасць асветнікаў падавала матэрыял у газету і дадатак, каб больш высвятляўся мясцовы вопыт» [2].

Так і атрымалася: аўтарамі артыкулаў на старонках «Працаўніка асветы» станавіліся, з аднаго боку, педагогі, з другога, прадстаўнікі Наркамасветы – дзяржаўнага органа, што займаўся пытаннямі адукацыі. Трэба адзначыць, што выданне цаніла сувязь з чытачамі. Напрыклад, у рубрыцы «Наша перапіска» настаўнікам, чые дасланыя артыкулы не планаваліся да друку, тлумачылася, па якіх прычынах артыкул не будзе надрукаваны.

Рэдакцыя была зацікаўлена ў разгортванні дыскусій на старонках свайго выдання. Так, побач з матэрыяламі на спрэчныя адукацыйныя праблемы, што патрабуюць абмеркавання, рабілася зноска «Артыкул друкуецца ў парадку абмеркавання» альбо «У парадку абгаварэння», такім чынам спрыяючы палеміцы сярод чытачоў. Яскравы прыклад – артыкул настаўніка Малыхіна з Мазыршчыны пад назвай «Калёквіумы ў

вясковай школе трэба аздаравіць» [3]. Прысвечаны ён праблеме экзаменавання вучняў па заканчэнні школы дзеля выяўлення ўзроўню іх ведаў. Водгукі на гэты артыкул і новыя погляды на атэстацыю вучняў хутка знайшлі месца на старонках наступных нумароў «Працаўніка асветы» [4; 5].

Тэматычны дыяпазон педагагічнага дадатку да «Савецкай Беларусі» быў шырокім. На яго старонках уздымалася пытанне **матэрыяльнага і прававога статусу** настаўнікаў. У выданні, напрыклад, прыводзіліся факты затрымання зарплат гэтым педагагічным работнікам.

Звяртае на сябе ўвагу артыкул «Дзецям вясковага асветніка трэба дапамагчы вучыцца», аўтар якога гаворыць, што «частка вясковага настаўніцтва не заўжды мае магчымасць даць сваім дзецям не толькі вышэйшую асвету, але і закончыць сярэднюю» па прычыне свайго нізкага матэрыяльнага становішча [6]. Выйсцем з гэтай сітуацыі аўтар артыкула бачыць выкарыстанне саюзам Працасветы вопыту «Таварыства ўзаемадапамогі навучальнікам і тым, хто вучыў у народных школах», што існавала ў дарэвалюцыйны час. Напрыклад, у Мінску гэтае таварыства ўтрымлівала інтэрнаты для дзяцей настаўнікаў, каб яны не здымалі кватэры [6].

Яшчэ адна тэма, якая актыўна абмяркоўвалася на старонках «Працаўніка асветы», – **павышэнне кваліфікацыі настаўніцтва,** бо «якасць значнай часткі новага настаўніцтва вельмі нізкая» [7, с. 3]. Пісалася і пра неабходнасць перагляду і змянення практыкі на педфаку БДУ, «каб яна дала студэнту хоць бы больш-менш грунтоўнае азнаямленне з пастаноўкай школьнай працы» [8].

Недастатковая кваліфікацыя настаўніцтва выкрывала і іншую праблему – адсутнасць у настаўніка спецыяльнай якаснай літаратуры. «Літаратура занадта дарагая і разам з тым мала карысная (…) Прачытаўшы цэлы том ці кніжку, не заўсёды можна знайсці хоць бы адну каштоўную параду» [9]. Гэта дае падставы меркаваць, што артыкулы метадычнага характару, якія друкаваліся на старонках «Працаўніка асветы» (напрыклад, аб прыёмах навучання пісьму, чытанню), карысталіся папулярнасцю ў настаўнікаў.

На старонках «Працаўніка асветы» таксама асвятлялася праблема **недахопу школьных будынкаў і, як вынік, неабходнасці пабудовы новых.** Як паведамляў у сваім артыкуле А. Баліцкі, на той час наркамасветы БССР, «усяго ў БССР (…) маюць уласныя будынкі толькі 59 % школ, усе іншыя змяшчаюцца ў наёмных памяшканнях (…) частка школ працуе ў 2–3 змены, што не дае ніякай магчымасці весці правільна заняткі» [10, с. 1].

Трэба адзначыць, што некаторыя нават новыя, толькі пабудаваныя школы мелі значныя хібы. Так, «у Вацлаўскай, нядаўна пабудаванай школе (Полаччына) надворная сцяна ўжо выгнулася, унутраныя сценкі зігзагападобныя; бэлькі, на якіх трымаецца столь, не ўзяты на балты, і столь дзеля гэтага не трывалая…» [10, с. 1–2]. Са старонак «Працаўніка асветы» А. Баліцкі заклікаў «ўсіх селькораў, настаўнікаў, усю працоўную інтэлігенцыю на сяле высвятляць у друку ўсе недахопы школьнага будаўніцтва; узяць школьнае будаўніцтва пад самы шырокі і пільны кантроль з боку ўсяго працоўнага насельніцтва» [10, с. 2]. Не лепш складвалася сітуацыя і **са школьным абсталяваннем**. Яшчэ ў 1928 г. у школах адчуваўся недахоп добрых парт. «Сустракаюцца школы, у якіх назіраецца поўная адсутнасцць якіх бы то ні было парт. Замест іх цягнуцца ад сцяны да сцяны дошкі, не габляваныя, прыбітыя цвікамі проста да бярозавых калодак…» [11, с. 7]. Дрэнныя школьныя ўмовы (шматзменнасць, адсутнасць добрага памяшкання і абсталявання) станавіліся прычынай **«хворасці дзяцей»**, пра што не мог не пісаць «Працаўнік асветы».

Такім чынам, дадатак «Працаўнік асветы» да газеты «Савецкая Беларусь» уздымаў вострыя для свайго часу праблемы ў сферы народнай адукацыі. На яго старонках асвятлялася пытанне матэрыяльнага і прававога статусу настаўнікаў, праблема недахопу школьных будынкаў, а таксама якаснага школьнага абсталявання. Разам з гэтым абмяркоўвалася неабходнасць павышэння кваліфікацыі настаўніцтва, друкаваліся матэрыялы метадычнага характару, неабходныя настаўнікам для арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

### Літаратура


1. *Лузгина С. В.* Пути становления и развития педагогической печати Белоруссии (1919–1932 гг.). Минск, 1975.
2. *Самцэвіч В.* Кожны настаўнік павінен выпісаць Савецкую Беларусь // Працаўнік асветы. 1928. № 13. С. 3.
3. *Малыхін.* Калёквіумы ў вясковай школе трэба аздаравіць // Працаўнік асветы. 1928. № 11. С. 2–3.
4. Я. Ж. Калёквіумы не выганяць са школы, а правільна іх арганізаваць // Працаўнік асветы. 1928. № 13. С. 2.
5. *Лявонік В.* Калёквіумы нельга ператвараць у экзамены // Працаўнік асветы. 1928. № 16. С. 4–5.
6. *Масюкевіч.* Дзецям вясковага асветніка трэба дапамагчы вучыцца // Працаўнік асветы. 1928. № 4. С. 4.
7. *Пытанні Н. Ш.* культурнай рэвалюцыі // Працаўнік асветы. 1928. № 6. С. 1–4.
8. *Гурвіч, Т.* Каго і як рыхтуе педфак БДУ? // Працаўнік асветы. 1928. № 16. С. 1.
9. М. Р. Да пытання аб павышэнні кваліфікацыі настаўніцтва // Працаўнік асветы. 1928. № 1. С. 7.

10. *Баліцкі А.* Школьнае будаўніцтва пад кантроль мас // Працаўнік асветы. 1928. № 4. С. 1–2.
11. *Шыёнак С.* Школьная парта // Працаўнік асветы. 1928. № 3. С. 6–7.